бібліятэках і фанатэках, навуковых і іншых спецыялізаваных установах. Відавочна, што авалоданне сучаснымі інфармацыйнымі тэхналогіямі дапаможа маладым музыкантам дасягнуць поспехаў у прафесіі.

Вопыт апошніх гадоў паказвае (гэта адзначаюць вядучыя спецыялісты-музыказнаўцы: Рагс Ю.М. Перспектывы і прынцыпы інфарматызацыі музычнай адукацыі // Мастацтва ў кантэксце інфармацыйнай культуры. Праблемы інфармацыйнай культуры. — М., 1996. — Вып. 4), што сучасныя патрабаванні інфарматызацыі музычнай адукацыі не зводзяцца да колькаснага пашырэння сістэмы інфармацыі (набыцця новай тэхнікі і аб'яднання яе ў камп'ютэрныя сеткі, выкарыстання сістэмы мультымедыя і сінтэзатараў). Маюць вялікае значэнне пераход у новую якасць, гуманізацыя навучання: уключэнне інфарматыкі ў сістэму традыцыйнага музыказнаўства, утварэнне станоўчай псіхалагічнай устаноўкі на выкарыстанне тэхнічных новаўвядзенняў, выкананне прыярытэту прынцыпаў даступнасці і паўнаты, карысных для далейшай творчай, педагагічнай і даследчай дзейнасці.

**Л.І.Сцепанцоў**, *прарэктар па навучальнай рабоце Беларускага інстытута праблем культуры*

# АСНОЎНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ РАЗВІЦЦЯ ВЫШЭЙШАЙ КУЛЬТУРАЛАГІЧНАЙ І МАСТАЦКАЙ АДУКАЦЫІ КАНЦА XX СТ.

Вышэйшая культуралагічная і мастацкая адукацыя ўяўляе частку сістэмы вышэйшай адукацыі краіны. Вылучаючыся сваімі адметнасцю і спецыфікай, яна прайшла гістарычны шлях, уласцівы ўсёй нацыянальнай сістэме прафесійнай адукацыі. Відавочныя наступныя этапы яе развіцця: 1) станаўленне; 2) удасканаленне структуры і зместу адукацыі; 3) інтэграцыя адукацыйных сістэм розных

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

узроўняў; 4) фарміраванне новай канцэпцыі адкрытай сістэмы прафесійнай адукацыі.

Спачатку будавалася сярэдняя спецыяльная культуралагічная і мастацкая адукацыя, падмурак будучай вышэйшай адукацыі. У 1918–1940-х гг. адбываліся станаўленне, фарміраванне сістэмы прафесійнай адукацыі, развіваліся масавыя формы навучання ў вузкаспецыялізаваных адукацыйных установах. Да вайны былі адкрыты харэаграфічнае вучылішча ў Мінску, музычныя вучылішчы ў Мінску, Магілёве і Гомелі, культасветвучылішча ў Магілёве. У тыя гады да выкладання ў іх прыцягваліся вопытныя практыкі, а таксама дыпламаваныя спецыялісты, якія закончылі вышэйшыя навучальныя ўстановы Масквы, Санкт-Пецярбурга.

Масавы выпуск спецыялістаў дазволіў у кароткі тэрмін умацаваць музычныя прафесійныя калектывы, удасканаліць сістэму культурна-асветнай работы ў рэспубліцы, павялічыць колькасць прафесіяналаў-выкладчыкаў прадметаў мастацтва ў школах. У сярэдніх спецыяльных навучальных установах закладаліся першапачатковыя прафесійныя навыкі, даваліся практычныя веды ў сферах мастацтва і культуры, фарміраваўся малады спецыяліст, здольны працягваць самаадукацыю, весці практычную самастойную працу. Выкладчыкі гэтых навучальных устаноў назапашвалі вопыт педагагічнай работы, што дазваляла ў далейшым выкарыстоўваць іх у новых ВНУ.

Чатырнаццаць гадоў існавання сярэдняй спецыяльнай адукацыі лагічна прывялі да адкрыцця ў 1932 г. вышэйшай навучальнай установы — Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі. Першымі студэнтамі яе сталі выпускнікі музычных вучылішчаў краіны, а выкладчыкамі – работнікі Мінскага музычнага вучылішча. Вучэбны працэс гэтай ВНУ быў пабудаваны на ўзор Маскоўскай і Пецярбургскай кансерваторый, выпускнікамі якіх былі большасць прафесараў Беларускай кансерваторыі. Першы выпуск музычнай ВНУ прадэманстраваў высокую якасць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падрыхтоўкі спецыялістаў: амаль усе яны потым папоўнілі выкладчыцкі склад кансерваторыі.

Удасканаленне структуры і зместу адукацыі адбывалася ў 1945—1985-я гг. Гэты час вызначаўся такімі падзеямі, як адкрыццё Беларускага тэатральнага інстытута ў 1945 г., яго мастацкага факультэта — у 1953 г., Мінскага інстытута культуры — у 1975 г. Апошняя ВНУ забяспечыла падрыхтоўку спецыялістаў для самых розных відаў культасветустаноў. Белдзяржкансерваторыя разгарнула падрыхтоўку спецыялістаў па ўсіх музычных спецыяльнасцях. Была адкрыта студыя опернай падрыхтоўкі, якая рыхтавала вакалістаў да работы ў Дзяржаўным акадэмічным вялікім тэатры оперы і балета, у Тэатры музычнай камедыі.

Гэты перыяд вызначаўся далейшым развіццём элементаў непарыўнасці сістэмы прафесійнай адукацыі, масавым адкрыццём дзіцячых школ мастацтваў — пачатковых устаноў прафесійнай арыентацыі ў галінах мастацтва і культуры. Тры буйнейшыя ВНУ рэспублікі забяспечвалі кадрамі тэатральна-відовішчныя прадпрыемствы, навучальныя ўстановы культуры, культурна-асветныя ўстановы. Рабіліся першыя крокі па стварэнні нацыянальнай сістэмы падрыхтоўкі навукова-педагагічных кадраў праз аспірантуры і асістэнтуры-стажыроўкі пры ВНУ. Большая частка спецыялістаў для ВНУ па-ранейшаму навучалася шляхам мэтавай падрыхтоўкі ў аспірантурах і асістэнтурах ВНУ Масквы і Санкт-Пецярбурга.

Умацоўвалася сістэма сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў краіны, якую ў поўным аб'ёме забяспечвалі педагагічнымі кадрамі тры вышэйшыя навучальныя ўстановы мастацтва. У сваю чаргу ССНУ з'яўляліся асновай для іх студэнцкага папаўнення.

На гэтым этапе захоўвалася сістэма цэнтралізаванага саюзнага забеспячэння агульнымі навучальнымі планамі, праграмамі без уліку нацыянальнай і рэгіянальнай спецыфікі. Фактычна існаваў жорсткі стандарт навучання, які ўжо не



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адпавядаў патрабаванням часу. Але лепшыя ўзоры выкладання мастацтва выдатнымі выкладчыкамі прабіваліся скрозь рэгламентаваную сістэму вучэбнай дакументацыі.

Інтэграцыя адукацыйных сістэм розных узроўняў адбывалася ў 1985—1995-я гг., якія былі пазначаны пачаткам дэмакратызацыі прафесійнай адукацыі, пераходам да стварэння сістэмы непарыўнай прафесійнай адукацыі.

У 1991 г. была створана Беларуская акадэмія мастацтваў, цэнтральная навучальная ўстанова сфер тэатральнага і выяўленчага мастацтваў. У кожнай вобласці былі адкрыты аддзяленні выяўленчага або дэкаратыўна-прыкладнога мастацтваў, існавалі дваццаць чатыры мастацкія школы, каля сарака аддзяленняў выяўленчага мастацтва дзіцячых школ мастацтваў. У 1992 г. створана Беларуская акадэмія музыкі, што ўзначаліла музычную адукацыю з дзевяццю музычнымі вучылішчамі, трыма музычнымі каледжамі і каля пяцістамі дзіцячых музычных школ. Адкрыццё ў 1993 г. Беларускага універсітэта культуры аб'яднала сістэму культуралагічнай адукацыі з дапамогай культасветвучылішчаў ці адпаведных аддзяленняў у кожнай вобласці, бібліятэчнага тэхнікума ў Магілёве.

Адбываецца інтэнсіўнае стварэнне ўсіх спецыяльнасцей навукова-педагагічнай падрыхтоўкі ў аспірантурах і асістэнтурах універсітэта культуры, акадэміі музыкі і акадэміі мастацтваў. Адкрыты два саветы па абароне доктарскіх дысертацый у Беларускім універсітэце культуры і савет па абароне кандыдацкіх дысертацый у Беларускай акадэміі музыкі.

У вышэйшых навучальных установах краіны ўдасканальваюцца вучэбныя планы, якія ўсё больш набліжаюцца да практыкі. Асновай навучання ў іх з'яўляюцца ўдзел у музычных, тэатральных калектывах, а таксама выступленні з канцэртнымі праграмамі, стварэнне карцін, скульптур, іншых твораў выяўленчага мастацтва з наступнай дэманстрацыяй на выстаўках. Адначасова



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўзмацняецца навуковая творчасць студэнтаў, адукацыя набліжаецца да еўрапейскіх універсітэцкіх стандартаў.

Абноўлены вучэбныя праграмы практычна па ўсіх прадметах навучання. Іх сучасны змест базіруецца на новых падыходах да выкладання з улікам як уласнага перадавога вопыту, так і дасягненняў еўрапейскай педагагічнай школы.

У вышэйшай школе складваецца выдатная сістэма выкладання, асаблівыя дасягненні назіраюцца ў сістэме індывідуальных урокаў па спецыяльнасцях інструментальнага выканання. На высокім узроўні забяспечваецца шэраг лекцыйных курсаў ва ўсіх трох ВНУ. Прыметна ажыўляецца метадычна-выдавецкая дзейнасць прафесарска-выкладчыцкага складу вышэйшай школы.

Сучасная канцэпцыя адкрытай прафесійнай адукацыі зыходзіць з таго, што гэта найбольш важная сфера сацыякультурнай дзейнасці, якая падтрымлівае і развівае інтэлектуальны патэнцыял грамадства і чалавека, з'яўляецца прыярытэтным сродкам падтрымкі рэформаў. Узгадаем — дзяржаўная палітыка развіцця і пераўтварэння прафесійнай адукацыі заснавана на наступных прынцыпах:

— гарантаваным забеспячэнні канстытуцыйных правоў на працу і адукацыю;

— свабодзе выбару, атрымання прафесіі;

— функцыянаванні эфектыўных сістэм, мадэлей, формаў і механізмаў прафесійнай адукацыі на аснове гнуткасці і непарыўнасці, максімальнай эфектыўнасці прафесійна-педагагічных працэсаў, комплекснага ўзаемадзеяння ключавых сацыяльных партнёраў;

— павышэнні адкрытасці сістэмы грамадству і грамадзянам усіх узростаў і катэгорый.

Сістэма мастацкай адукацыі Беларусі функцыянуе ва ўмовах актыўнага рэфармавання, якое ажыццяўляецца ў дачыненні ўсёй сістэмы адукацыі. Для распрацоўкі, навуковага абгрунтавання канцэпцыі рэфармавання прафесійнай мастацкай адукацыі Беларусі ў межах дзяржаўнай навукова-тэхнічнай праграмы "Культура"

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ

было зацверджана заданне, якое заключаецца ў тым, каб распрацаваць канцэпцыю прафесійнай адукацыі ў галіне мастацтва ў Рэспубліцы Беларусь (навуковы кіраўнік В.Л.Яканюк).

Вызначаны такія асноўныя мэты:

1) стварэнне, захаванне і развіццё нацыянальных мастацкіх школ як стрыжнявога фактару і падмурка беларускай мастацкай культуры;

2) навучанне і выхаванне творчых кадраў у галінах музычнага, выяўленчага і тэатральнага мастацтваў на ўсіх узроўнях прафесійнай падрыхтоўкі;

3) ажыццяўленне творчай і навукова-даследчай дзейнасці ў галіне мастацтва.

У адпаведнасці з гэтымі мэтамі мастацкая адукацыя рэспублікі вырашае задачы:

— задавальнення творчых і адукацыйных патрабаванняў грамадзян;

— прафесійнай падрыхтоўкі творчых, навуковых і педагагічных кадраў беларускіх ВНУ культуры і мастацтва;

— стварэння новых твораў музычнага, выяўленчага і тэатральнага мастацтваў;

— правядзення фундаментальных, пошукавых і прыкладных навуковых даследаванняў у галінах мастацтва і навукова-метадычнага забеспячэння мастацкай адукацыі;

— мастацкай асветніцкай дзейнасці ў нашай краіне і за мяжой.

Распрацоўшчыкі канцэпцыі мастацкай адукацыі выявілі розныя ўзровень і вопыт вырашэння метадалагічных праблем музычнай, выяўленчай і тэатральнай адукацыі, абгрунтавалі асноўны фактар, які аб'ядноўвае розныя мастацкія галіны і заключаецца ва ўзаемадзеянні дзвюх падсістэм культуры: мастацтва і адукацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ